**Тарасёнак, І**. «За вернасць доўгу і Айчыне» / І. Тарасёнак // Веснік Глыбоччыны. — 2009. — 28 студз. — С. 4.

**«ЗА ВЕРНАСЦЬ ДОЎГУ І АЙЧЫНЕ»**



Уладзіміра Ліпчыка ў армію прызвалі ў 1987 годзе з Наваполацка, дзе ён вучыўся на нафтавіка. Трапіў у Афганістан. Служыў у мотаманеўровай групе пад афганскім горадам Герат. У 1988 годзе ў баі Уладзімір быў цяжка паранены. Лячыўся ў ваенным шпіталі ў Ашхабадзе, дзе і пазнаёміўся з будучай жонкай. Пасля распаду Саюза Уладзімір з сям'ёй пераехаў на сваю радзіму – у Беларусь.

Уладзімір Мікалаевіч, ветэран вайны ў Афганістане, кавалер ордэна Чырвонай Зоркі. У мінулым годзе 3 ліпеня па запрашэнні грамадскага аб'яднання «Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане» Партызанскага раёна горада Мінска ў ліку пачэсных гасцей ён пабываў на мерапрыемствах, прысвечаных Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

А 4 ліпеня ў горадзе Касцюковічы Магілёўскай вобласці адбылося святкаванне стогадовага юбілею заснавальніка сучасных паветрана-дэсантных войск, Героя Савецкага Саюза В. Ф. Маргелава. На ўрачыстасці, прысвечанай легендарнаму галоўнака-мандуючаму ПДВ, прысутнічаў і сын генерала з Масквы. У складзе дэлегацыі былі прадстаўнікі Міжнароднага Грамадскага аб'яднання «Саюза дэсантнікаў Расіі». Галоўная падзея знамянальнага дня – адкрыццё мемарыяльнага помніка В. Ф. Маргелаву. Па хадайніцтву «Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане» перад старшынёй Усерасійскага Саюза грамадскі аб'яднанняў ветэранаў дэсантных войск «Саюза дэсантнікаў Расіі» генералам-палкоўнікам В. А. Ачалавым былі ўзнагароджаны медалём «За вернасць доўгу і Айчыне», заснаваным Расійскім Саюзам ветэранаў вайны ў Афганістане, больш за 20 чалавек – ветэранаў баявых дзеянняў, прадстаўнікоў грамадскасці, членаў актыву арганізацыі. У ліку ўзнагароджаных быў і Уладзімір Мікалаевіч Ліпчык.

**І. Тарасёнак**

**На здымку:** уручэнне медаля «Завернасць доўгу і Айчыне» глыбачаніну, ветэрану вайны ў Афганістане Уладзіміру Мікалаевічу Ліпчыку